10. Отчёт о деятельности ЦСБ БССР за июль – сентябрь 1920 г. // НАРБ. – Фонд 30. – Оп. 1. – Д.3. – Л. 2.
11. Отчёт об эвакуации и деятельности центрального бюро за 1920 г. // НАРБ. – Фонд 30. – Оп. 1. – Д. 1. – Л. 3. тоже НАРБ. – Фонд 30. – Оп. 4. – Д. 1. – Л. 1 – 4.
12. План работ по ЦСУ БССР на 1925–1926 гг. // НАРБ. – Фонд 63. – Оп. 1. – Д. 1049. – Л. 22 – 126.
13. Положение о государственной статистике БССР на 1924 г. // НАРБ. – Фонд 102. – Оп. 1. – Д. 30. – Л. 38 – 42.
14. Постановление коллегии ЦСБ БССР о возвращении на работу сотрудников статистики // НАРБ. – Фонд 30. – Оп. 1. – Д.2. – Л. 39.
15. Протокол № 8 заседания Коллегии ЦСБ ССРБ от 22.10.1920 г. // НАРБ. – Фонд 30. – Оп. 1. – Д. 2. – Л. 16–17, 39.
16. Список добровольных статистических корреспондентов Бегомльского района Борисовского округа на 01.05.1925 г. // ГАМн. – Фонд 718. – Оп. 1. – Д. 1049. – Л. 12–13.

**(Дата подачи: 18.01.2018 г.)**

*Т. В. Пятрова*
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск
*T. Piatrova*
Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research, Minsk

**УДК 272(091):726.8**

## НЕКРОПАЛІ БЕЛАРУСІ І ГРАМАДСТВА: ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКІ РЭВІТАЛІЗАЦЫІ

## NECROPOLISES OF BELARUS AND SOCIETY: THE THEORY AND PRACTICES OF REVITALIZATION

*У артыкуле некропалі характарызуюцца як сацыяльная прастора, месца экстрапаляцыі і прыняцця вопыту мінулых пакаленняў. Акрэслены стан і перспектывы працы са старымі некропалямі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Праводзіцца аналіз магчымасцей уключэння некропаляў у сучаснае сацыяльна-эканамічнае жыццё грамадства.*
*Ключавыя словы: некропалі; рэвіталізацыя; гісторыка-культурная спадчына; сацыяльная прастора.*

*The article presents a system of turn old cemeteries in the social and socio-economic life of modern society. Revitalization of cemeteries seen as an opportunity to do tourist's point, museum's place, ecozone.*
*Key words: necropolis; revitalization; historical and cultural heritage; social space.*

Некропалі ў сістэме агульнай нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны займаюць асобнае месца. Стаўленне да некропаляў ва ўсе часы было дваякае. З аднаго боку, гэта месца асабістага смутку, з другога – гэта цалкам натуральная хроніка сацыяльнага развіцця грамадства ў пэўны гістарычны перыяд.

За апошнія гады ў шырокіх колах беларускага грамадства паўстаюць пытанні аб неабходнасці актуалізацыі некрапалістычнай спадчыны і пошуку аптымальных шляхоў гарманічнага суіснавання «горада мёртвых» сярод «горада жывых» [1].

Далёка не ўсе аб'екты некрапалістычнай спадчыны не ўсе аб'екты ўтрымліваюцца належным чынам. Гэта сведчыць аб тым, што працэс успрымання каштоўнасці некропаляў як сацыяльнай і інфармацыйнай прасторы мае патрэбу ў пераасэнсаванні і правядзенні дадатковых навуковых даследаванняў па мадэрнізацыі гэтых помнікаў гістарычнай памяці

Паводле энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі» некропаль – гэта група старажытных пахаванняў у адным месцы [2, с. 462].

Аднак сённяшняе сацыяльнае азначэнне не зусім адпавядае афіцыйнаму тлумачэнню. На сучасным этапе тэрмін некропаль ужываецца не толькі ў адносінах да старажытных пахаванняў, але разумеецца як «вялікія могілкі», «старыя закрытыя могілкі», «могілкі, якія маюць асобнае гісторыка-культурнае значэнне».

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пахаванні і пахавальнай справе» могілкі – месца, прызначанае для пахавання ў зямлю целаў (парэшткаў) памерлых і скрыняў з прахам (попелам) [3].

З другога боку, некропаль варта разглядаць як інфармацыйную прастору, якая акумулюе ў сабе значныя пласты інфармацыі, якія адносяцца да гісторыі культуры, рытуальных практык, адлюстроўвае сацыяльна-дэмаграфічную структуру насельніцтва ў яе дынаміцы, перадае моўныя і мастацкія асаблівасці мясцовасці і інш.

Унутраная стратыфікацыя некропаля (наяўнасць галоўных радоў, месцаў для знакамітых асобаў (асабліва ля капліцы), так званыя родавыя месцы і г. д.), семіётыка могілак у цэлым і асобных іх частак, іх стан, наяўнасць ці адсутнасць «украпаванняў» – гэта своеасаблівая хроніка сацыяльнага жыцця з часу фарміравання некропаля і да сучаснасці.

У месцах спачынку вельмі моцна выяўляецца нацыянальны каларыт. Аналіз асаблівасцей напісання на надгробках імёнаў, эпітафій сведчыць аб ступені развіцці мовы, стане дыялектаў, сацыяльным стаўленні да мовы (моў), што акутвае пэўны рэгіён. Па тым, як уладкаваны месцы пахавання, можна зрабіць высновы аб тым, як ставіліся вернікі да смерці, у што верылі.

Таксама, супастаўляючы даты на помніках, можна праводзіць паралелі з гістарычнымі падзеямі, якія разгортваліся ў мясцовасці (пажары, войны, эпідэміі і г. д.), і інш. [4].

З улікам таго, што могілкі перш за ўсё – гэта клопат жывых аб памерлых, яны існуюць і даглядаюцца як прыватная зона, пакуль ёсць сваякі, наведвальнікі, якія прыбіраюць і добраўпарадкаваюць, адчуваюць сваю асабістую прыязнасць да пахаваных [5].

Лёс могілак, якія застаюцца з мінулых стагоддзяў, якія належалі папярэднім жыхарам горада (месца, вёскі), утварыліся падчас воінскіх канфліктаў, вырашаецца толькі здольнасцю мясцовых супольнасцей і адміністрацый, культурнай палітыкай краіны, якая зацікаўлена ў тым, каб пабачыць у іх гістарычную і этнаграфічнаю каштоўнасць і ўзяць на сябе цяжар па забеспячэнні іх належнага захавання.

Дыскурс аб функцыянале прасторы некропаляў ўзнік далёка не сёння. Яшчэ ў сярэднявечнай Еўропе гарадскія могілкі не лічыліся толькі ўласна месцам асабістага смутку і апошняга спачыну. Так, даследчык Ф. Ар’ес у сваёй кнізе «Чалавек перад тварам смерці» паказвае, што ў перыяд усяго сярэднявечча да самага пачатку XVII стагоддзя ў Еўропе могілкі былі дастаткова публічнай прасторай. Там шпацыравалі, сустракаліся, нават гандлявалі, праводзілі рэлігійныя і свецкія мерапрыемствы (напрыклад, на могілках адпраўлялася правасуддзе). Жыццё і смерць былі побач [5, 6–12].

Сёння, пасля перыяду пэўнай сакралізацыі, некропалі становяцца не проста публічнай прасторай, а своеасаблівымі культурнымі цэнтрамі.

Гэтая тэндэнцыя ў другой палове XX стагоддзя даследчыкамі была ўспрынята неадназначна. Так, М. А. Грыва ў сваёй кнізе «Могілкі Монпарнас у Парыжы: прастора мёртвых або прастора жывых?» піша, што «могілкі ператварыліся ў прастору жыцця, сталі выкарыстоўвацца як паркі, як нерухомая маёмасць…. Могілкі становяцца турыстычным месцам! Што значыць гэтая культурная і сацыяльная трансфармацыя? Стаўшы турыстычным атракцыёнам, культурнай славутасцю, прастора мёртвых выстаўляецца напаказ, як свайго роду палеалітычны монстр» [5, 8].

Калі аднесці сакральны і рэлігійны складнік на другі план і не ўспрымаць абурэнні некаторых даследчыкаў наконт непрымальнасці публіцызацыі некропалей, можна прасачыць, што толькі працэс актыўнага ўключэння некропаляў у сучасны сацыякультурны кантэкст (рэвіталізацыя) можа выратаваць іх ад разбурэння і апаганьвання.

Тэрмін «рэвіталізацыя» ў першасным значэнні азначае «вяртанне да жыцця». У адносінах да культурнай спадчыны можна гаварыць, што рэвіталізацыя – гэта працэс пераасэнсавання спадчыны і ўключэння яе ў сучасны сацыяльна-эканамічны і культурны кантэкст.

Часцей за ўсё гэтае азначэнне выкарыстоўвацца ў дачыненні да помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва, таму што яны праз змену свайго функцыянальнага прызначэння могуць натуральна выкарыстоўвацца грамадствам і прыносіць эканамічны эфект як нерухомасць, авеяная да таго ж яшчэ гістарычным і легендарніцкім арэалам.

На першы погляд працэс рэвіталізацыі і некропалі несумяшчальны, але гэта памылковае ўяўленне.

На сённяшні дзень існуе чатыры шляхі рэвіталізацыі старых некропаляў, якія здольны забяспечыць не толькі падтрыманне іх належнага стану, але і будуць спрыяць сацыякультурнаму развіццю, турыстычнай прывабнасці

мясцовасці. Гэта ўключэнне некропаляў у турыстычныя маршруты, трансфармацыя (з захаваннем помнікаў і пахаванняў) могілак у рэкрэацыйную паркавую зону, музеефікацыя некропаляў і некропаль як экспазіцыя.

Усе прыведзеныя прыклады менеджменту некрапалістычнай спадчынай маюць увасабленне ў рэчаіснасці.

Адным з самых папулярных варыянтаў з'яўляецца ўключэнне могілак у турыстычныя маршруты.

З пачатку XXI стагоддзя ў свеце назіраецца своеасаблівы бум «могілкавага» турызму. У Вялікабрытаніі некаторыя турыстычныя цэнтры нават спецыялізуюцца на складанні некрапалістычных маршрутаў, якія ўяўляюць сабой мапу пахаванняў знакамітых брытанцаў па свеце ў залежнасці ад цікаўнасцей заяўніка [1].

Самымі вядомымі турыстычнымі кропкамі ў гэтым кірунку з'яўляюцца Хайгейтскія могілкі (Лондан), могілкі Пер-Лашэз (Парыж), могілкі Грын-Вуд (Нью-Ёрк), Данскія могілкі (Масква), яўрэйскія могілкі на Аліўнай гары (Ерусалім), могілкі Расу (Вільнюс), манастырскія могілкі (Зальцбург), пратэстанцкія могілкі (Рым), яўрэйскія могілкі (Прага), цэнтральныя могілкі (Вена) і інш.

Пры гэтым кола атракцый, якія прапануюцца турыстам, становіцца ўсё больш разнастайным. Так, напрыклад, у сеціве актыўна папулярызуецца новая турыстычная паслуга «Пражскі некропаль запрашае турыстаў на начны шпацыр», прычым праграма экскурсіі не разлічана на спецыфічныя субкультуры, а арыентавана на шырокае кола «рамантыкаў».

Цікаўнасць турыстаў да могілак можа быць абумоўлена не толькі высокамастацкімі вартасцямі надмагілляў або вядомасцю пахаваных. Наведванне некропаляў дзеля пранікнення ў культурныя асаблівасці рэгіёна, знаёмства з натуральнымі этнічнымі і сацыяльнымі традыцыямі таксама паступова набірае папулярнасць [4, с. 186–188].

Паступова пашыраецца кола тых, хто шукае месца спадчыну продкаў, і паколькі не заўжды архівы даходзяць да нашых дзён (некаторыя згубіліся, некаторыя згарэлі падчас войнаў), некропалі таксама выступаюць крыніцай ведаў аб продках.

Другім шляхам рэвіталізацыі з'яўляецца музеефікацыя могілак. Існуе практыка, калі пэўныя закрытыя могілкі становяцца філіяламі буйных музеяў. Прадугледжваецца штат супрацоўнікаў, якія даследуюць і працуюць на могілках. Праводзяцца мерапрыемствы па добраўпарадкаванні тэрыторыі могілак, што спрыяе ўзнікненню своеасаблівага «прамога дахода» ад продажу ўваходных білетаў. У параўнанні з першым варыянтам для ўваходу некропаля ў склад пэўнага музея ўсё ж патрэбна наяўнасць наступных крытэрыяў: мець выбітныя творы мастацтва (скульптура, рэльеф, разьбярства і г. д.), пахаванні знакамітых дзеячаў гісторыі, культуры, навукі і г. д., быць непасрэдна звязаным і шырока прадстаўляць гісторыка-культурны і этнаграфічны пласт месца.

Такім прыкладам з’яўляецца музей-некропаль «Літаратарскія мастакі» (Піцербург), Лычакаўскія могілкі (Львоў), музей-некропаль у Гласневіне (Дублін). Апошні прыклад вельмі цікавы, бо сам па сабе музей уяўляе сабой шкляны будынак (размешчаны на тэрыторыі могілак), у якім знаходзіцца дзесяціметровая панэль, абсталяваная сэнсарнымі маніторамі. У базе звестак змешчана інфармацыя пра гісторыю жыцця двухсот тысяч чалавек, якія пахаваны на гэтых могілках.

Акрамя гістарычных і мемарыяльных каштоўнасцей, могілкі могуць быць і зонай рэкрэацыі. Сумяшчэнне функцый могілак і парка ўтвараюць непаўторную атмасферу. Псіхолагі адзначаюць, што ў такіх месцах чалавеку прасцей адарвацца ад надзённай мітусні, разабрацца ў сябе, а некаторым вызваліць эмоцыі. У сённяшнім грамадстве, дзе асабістай прасторы становіцца ўсё меней, некропаль – гэта тое месца, дзе можна проста пабыць сам насам са сваімі пачуццямі [5, 4–16].

Такімі могілкамі-паркамі з’яўляюцца Інгвулд-парк (Каліфорнія), востраў-некропаль Людвігштайн (Выбарг), могілкі Пер-Лашэз (Парыж), могілкі Альтдорф (Гамбург), цэнтральныя могілкі (Вена), могілкі Фрыдрыхсфельдэ (Берлін).

У заканадаўстве многіх краін могілкі па статусе роўныя грамадскім і прыватным зялёным зонам, якія не падлягаюць забудове.

Могілкі, якія размяшчаюцца ў лясных масівах, могуць цалкам станавіцца пунктамі экатурызму, экаадпачынку, як, напрыклад, Шчэцінскі некропаль. На яго тэрыторыі па прыкладных падліках расце каля 415 відаў і гатункаў дрэў. Варта адзначыць, што сістэма названага парка ўтваралася не стыхійна, а паступова, зрабіўшыся сапраўдным помнікам прыроды.

Эказапаведнікам таксама сталі і былыя яўрэйскія могілкі ў Берліне. Біёлагі выявілі тут больш за 600 відаў раслін і жывёл, пры гэтым многія з іх з’яўляюцца тыповымі прадстаўнікамі глухіх лясоў. Сярод знаходак – 72 віды лішайнікаў, 64 відаў павукоў, 39 відаў жужалю, 5 відаў кажаноў і некалькі відаў папараці, якія знаходзяцца на мяжы знікнення, 44 віды птушак.

Калі казаць пра сацыяльнае ўспрыманне некропаляў у сучасным беларускім грамадстве і ўзроўні менеджменту некрапалістычнай спадчынай, варта канстатаваць, што мы толькі на пачатку шляху да асэнсавання некропаляў як культурнай і сацыяльнай прасторы.

З аднаго боку, могілкі Беларусі – гэта вялікая пляцоўка для навуковых і этнаграфічных даследаванняў, з другога – неапрацаваны пласт сацыяльна-культурнага жыцця. Амаль кожны рэгіён краіны захаваў могілкі, датычныя гістарычных вераванняў і этнасаў, якія ў пэўны час пражывалі на яго тэрыторыі: татарскія, яўрэйскія, нямецкія грамадзянскія (лютаранскія) рускія, польскія могілкі. Пры гэтым варта адзначыць, што часцей за ўсё прысутнасць намінацыі могілак прыметнікамі «рускія» і «польскія» сведчыць не пра нацыянальную прыналежнасць пахаваных, а пра іх ве-

равызнанне – праваслаўны, каталік. Былі яшчэ і ўніяцкія могілкі, якія ўзнікалі з большага ў перыяд з 1596 па 1839 г. У 1839 г. уніяцкая царква была знішчана і далучана да Рускай праваслаўнай царквы. З улікам скасавання Уніі могілкі паступова аб'ядноўваліся з праваслаўнымі або каталіцкімі [4, с. 186–188].

Па стане на студзень 2017 года ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржспіс) уключана 76 могілкаў, з якіх 67 – вайсковыя могілкі. Такім чынам, толькі 9 грамадзянскіх могілкаў на ўсю рэспубліку маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці [6].

Пры гэтым на тэрыторыі Беларусі старых некропаляў, якія могуць уяўляць прывабнасць для турыстаў, даследчыкаў, гісторыкаў і інш, значна больш. Кожны раён мае хаця б два цікавыя некропалі з помнікамі XIX стагоддзя, якія прэзентуюць гістарычную і этнаграфічную адметнасць раёна, гэта некалькі соцень старых праваслаўных і каталіцкіх могілкаў, больш за дзвесце яўрэйскіх, некалькі дзясяткаў татарскіх мізараў [4, с. 186–188].

На жаль, калі не вядзецца размова аб вайсковых могілках, старыя грамадзянскія некропалі, аддадзены на волю сумлення мясцовых жыхароў, абыякавых валанцёраў, адміністрацый і камунальных службаў.

Але і тут не ўсё проста. За вайсковымі пахаваннямі ажыццяўляецца абавязковы дагляд, замацоўваецца патранаж, ладзяцца арганізаваныя валанцёрскія прыборкі. Таксама вядзецца ўлік не толькі ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «О погребении и похоронном деле», але і пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Об увековечении памяти защитников Отечества и жертв войн». Такім чынам, абавязак па іх утрыманні і захаванні бярэ на сябе грамадства ў цэлым.

Што тычыцца грамадзянскіх, рэлігійных і этнічных могілкаў, то яны падпарадкоўваюцца толькі Закону Рэспублікі Беларусь «О погребении и похоронном деле». У адпаведнасці з артыкулам 25 Закона пасля закрыцця могілкаў яны могуць быць невіляваны і выкарыставаны пад зялёныя насаджэнні.

Гістарычная практыка сведчыць аб тым, што пасля вайны стаўленне беларускага грамадства да некропаляў (калі там не пахаваныя знакамітыя дзеячы) было ў большай ступені ўтылізарным, акрамя таго, могілкі падзялілся на «свае» і «чужыя». Пры гэтым «свае» з большага даглядаюцца, а «чужыя» ў асноўным пакідаюцца на волю лёсу.

Падчас Другой сусветнай вайны ў Беларусі амаль на тры чвэрці скарацілася колькасць яўрэяў. Адны загінулі ў гета і лагерах, другія мігравалі. Але шматлікія яўрэйскія могілкі засталіся, многія з іх сталі ахвярамі вандалаў, шматлікія могілкі ў занядбанні, а мясцовымі жыхарамі яны не ўспрымаюцца як «свае», праз што не ўзнікае пачуцця неабходнасці клопату аб іх. Толькі з пачатку XXI стагоддзя тэндэнцыя да актуалізацыі

яўрэйскай спадчыны стала мець станоўчыя вынікі. На некаторых некропалях праводзіцца працэдура інвентарызацыі могілак. Невялікая частка з іх толькі апісваецца, некаторыя паступова добраўпарадкоўваюцца (як, напрыклад, у Камаях, Чавусах), але ўсё гэта толькі малая частка з аб'ёму, які патрабуе вывучэння і асэнсавання.

Некаторыя старыя каталіцкія могілкі (праз міграцыю шматлікіх каталікоў, асабліва ў Заходняй Беларусі) таксама трапілі ў катэгорыю «чужых», і мясцовыя жыхары, не адчуваючы асабістай прыязнасці, за імі не даглядаюць. З другога боку, некаторых старых праваслаўных могілак гэта таксама кранулася [4, с. 186–188].

Важна адзначыць, што ў апошнія гады тэндэнцыя да перагляду адносінаў да некропаляў у беларускім грамадстве стала паступова змяняцца. Актывістамі праводзяцца інвентарызацыі могілак, некаторыя могілкі добраўпарадкоўваюцца (могілкі ў Ракаве, Міры, Пінску, Уселюбе і г. д.), выпадкі з апаганьваннем старых магіл і нівіляваных некропаляў выклікаюць больш вострую рэакцыю сярод грамадства. Тым не менш, справа інвентарызацыі і добраўпарадкавання старых некропаляў застаецца больш клопатам нешматлікай групы грамадскіх актывістаў, чым устойлівай тэндэнцыяй, якая падхопліваецца на дзяржаўным узроўні.

Аб гэтым яскрава сведчыць колькасць невайсковых могілкаў, якія ўключаны ў Дзяржспіс, і дынаміка разгляду адпаведных прапаноў Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны (далей – Рада). Так, у 2001 годзе Радай было прынята станоўчае рашэнне аб неабходнасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Комплексу Кальварыйскіх могілак XVIII стагоддзя ў г. Мінску, у 2002 г. – манастырскім могілкам XVIII стагоддзя ў Віцебску, тром капліцам на старых могілках XIX стагоддзя ў г. Рагачове, могілкам салдат Першай сусветнай вайны ў в.Тамашоўка, у 2003 годзе – усім 67 вайсковым могілкам (тут неабходна прыняць да ўвагі, што ініцыяванне пытання і разгляд матэрыялаў адбываўся цэнтралізавана), Усходнім могілкам XX стагоддзя ў г. Мінску, у 2011 г. – татарскім могілкам перыяду сярэднявечча ў в. Каробчыцы, каталіцкім могілкам XIX стагоддзя ў г. Магілёве, у 2012 годзе – Трышынскім могілкам XIX стагоддзя ў г. Брэсце, комплексу старых праваслаўных могілкаў XIX стагоддзя ў в. Ракаў [6]. Разам з тым застаецца яшчэ цэлы шэраг унікальных некропаляў (Кобрынскі, Пінскі некропалі, старыя каталіцкія могілкі ў г. Гродна і інш.), якія застаюцца па-за аховай як гісторыка-культурная каштоўнасць.

У Беларусі турыстычнай папулярнасцю карыстаюцца Кальварыйскія могілкі (Мінск), Трышынскія могілкі (Брэст), Гродзенскія могілкі (Гродна), Крысаўскія могілкі (Дзяржынскі раён) і г. д. Але стан іх захавання і інфармацыйная кампанія па іх папулярызацыі даюць падставу сцвярджаць, што ў беларускага грамадства яшчэ не саспела разуменне

некропаляў як аб’екта турыстычнага прыбытку. Экскурсіі носяць больш стыхійны, чым рэгулярны характар. У пэўнай ступені паркам-некропалем можна назваць Вайсковыя могілкі ў Мінску, Трышынскія могілкі ў Брэсце.

Такім чынам, для актуалізацыі некрапалістычнай спадчыны Беларусі і забеспячэння ўстойлівасці яе захавання неабходна рэалізацыя пэўных крокаў.

Па-першае, гэта рэгулярная праца па ўсведамленні мясцовымі жыхарамі таго, што могілкі – гэта не проста месца ўтылізацыі парэшткаў і асабістага смутку, а неад’емная частка культурнай спадчыны. Па-другое, больш актыўнае ўключэнне некропаляў у турыстычныя маршруты з прывязкай да пэўнай тэматыкі ў залежнасці ад спецыфікі могілак. Па-трэцяе, паступовае змяненне вектара ўспрымання старых некропаляў у культурна-адукацыйны бок і, у пэўным сэнсе, асэнсаванне некропаля як экалагічнай зоны. Усё гэта будзе спрыяць сацыяльнай актывізацыі і інтэграцыі мясцовага насельніцтва вакол аб’ектаў і іх захаванню як часткі агульнай культурнай спадчыны.

Разам з тым варта адзначыць, што рэалізацыя акрэсленых кірункаў і любой з абраных для могілкаў канцэпцый рэвіталізацыі (могілкі-музей, парк, турыстычны пункт, рэкрэацыйная зона) немагчыма без цеснай узаемасувязі і паразумення між усімі наяўнымі сацыяльнымі групамі і інстытутамі (сям’я, рэлігійная абшчына, мясцовая ўлада, установы адукацыі і культуры і г. д.).

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Дубавік, С.* Post Mortem: пра што кажуць пахавальныя помнікі: [аб Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Post Mortem. Пахавальныя помнікі ў гісторыка-культурнай прасторы: праблемы вывучэння і захавання», Мінск] / С. Дубавік // Навука. Навуковая, вытворча-практычная газета Беларусі. – № 46. – Мінск, 2016 – С. 4.

2. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск, 1993. – 702 с.

3. О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О погребении и похоронном деле» [Электронный ресурс] Закон Республики Беларусь от 8 января 2015 г. № 237–З / Нац. правовой Инт. портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/ocument/?guid=3871&p0= H11500237&p1=1. – Дата доступа: 15.04.2017.

4. *Грунтов, С. В.* Память и забвение в пространственной перспективе: к функциональному анализу семантики белорусских традиционных кладбищ / С. В. Грунтов // Проблемы методологии социогуманитарного познания: диалектика и герменевтика: материалы Международного коллоквиума, 14 мая 2009 г., Минск / редкол.: М. Е. Кобринский (гл. ред.) [и др.]. – С. 186–188.

5. *Разумова, И. А.* Некрополь как социальное пространство: функциональные аспекты / И. А. Разумова // Некрополи Кольского Севера: изучение, сохранение, коммуникация. – Мурманск: Мурм. гос. гуманитар. ун-т, 2013. – С. 4–16.

6. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / уклад. В. Я. Абламскі [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2009. – 684 с.


**(Дата падачы: 28.02.2018 г.)**